Источник:  **«Звязда» - 2012-04-21**

# Паміж радкамі дакументаў

**"Дарагі Янка!**

*Пісьмо тваё і тэлеграму атрымала! Я вельмі рада, што ты лечышся! Лячысь, папраўляйся! Навін у Пячышчы мала. Жудкая таска — пастата. У Наякшыных дома цяжка, вельмі цяжка! Не знавем, аб чым гаварыць. Што слышна ў нашых хлопцаў? Дзе ты быў, у якіх сваіх прыяцеляў. Шлю прывет тым, хто мяне хаця трохі памятае. Думаю, што такіх будзе мала. Перадаю просьбы:*

*1) Парыкмахершы — яна просіць табе напомніць купіць машынку для стрыжкі.*

*2) Зоі (буфетчыцы) купіць браслет для гадзінніка маталічны.*

*3) Тбаю (зам. дырэктара) — акуляры 2 стекла размер 3,5 ён вельмі просіць.*

*Калі ты думаеш прыехаць? Шлю шчырае прывітанне. Жадаю паправіцца, Владка..."*

Вытрымка з ліста Уладзіславы Францаўны, жонкі Янкі Купалы. Адрас на канверце: "Москва. Гостиница "Москва". Комната № 414. Писателю Янке Купале".

Ліст, які застаўся без адказу. Але захаваўся ў гісторыі. Захаваўся ў архівах як сведчанне таго, што яго чакалі. І ён павінен быў вярнуцца, ужо хоць бы дзеля таго, каб выканаць просьбы іншых людзей.

Ліст гэты змешчаны ў зборніку дакументаў і матэрыялаў "Купала і Колас, вы нас гадавалі", укладальнікамі якіх сталі Вячаслаў Селяменеў і Віталь Скалабан. Дзве кнігі выйшлі летась. Значыць — своечасова. Таму што ёсць магчымасць у год звароту да спадчыны беларускіх класікаў адкрыць прычыны, можа, некаторых іх твораў альбо ўчынкаў. А яшчэ важна, каб сучасныя нашы суграмадзяне зразумелі: пісьменнікі са школьных падручнікаў былі жывымі людзьмі, якія жылі ў пэўных абставінах.

Такую магчымасць даюць якраз гэтыя зборнікі, лічыць **літаратуразнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Мушынскі,** які быў галоўным рэдактарам гэтага выдання. Яго я распытваю пра тое, ці можна праз такія кнігі прыцягнуць увагу людзей да класікаў, каб іх чыталі і адкрывалі нешта новае — праз тыя ж архіўныя дакументы, якія друкуюцца ўпершыню.

— Я выступаў з дакладам пра гэтую кнігу на "Каласавінах" і, як навуковы рэдактар, выказаў меркаванне, што калі выйдзе трэцяя кніжка, то гэтая праца вартая таго, каб быць адзначанай высокай прэміяй. Гэта мая ацэнка вартасці гэтай кнігі.

Я сам выкарыстаў гэтыя матэрыялы ў "Летапісе жыцця і творчасці Коласа" — кнізе, якую рыхтую ў якасці юбілейнага выдання. Я даволі шчодра выкарыстоўваю матэрыялы і з першай кніжкі, і з другой, і нават з трэцяй, хоць яна яшчэ не выйшла (з дазволу Нацыянальнага архіва цытую па крыніцах, якія пазначаны).

**— Такое выданне сведчыць: няма мяжы ведам...**

— Так і ёсць! Чым гэта кніжка каштоўная? Яна дае нам сапраўды багаты новы матэрыял, новыя звесткі, новыя звесткі пра Купалу і Коласа. Бо раней працы, прысвечаныя ім, былі прыгладжаныя. Вострыя вуглы і канфліктныя сітуацыі старанна абыходзілі не толькі ў падручніках, а нават у сур'ёзных даследчых працах. Што ж, быў такі час, такая атмасфера,

што мы не заўсёды асмельваліся, ды і ў нашым распараджэнні не так багата было матэрыялу такога кшталту. У гэтых кніжках такое багацце новых архіўных матэрыялаў, якія паказваюць, што творчае жыццё і творчасць саміх нашых класікаў была нашмат складанейшай, нашмат больш драматычнай, чым мы ўяўлялі. Сведчанне — тыя ж выклікі Коласа ў следчыя органы, каб ён даў паказанні супраць міфічнай арганізацыі "Саюз вызвалення Беларусі". Мы ведаем, што гэтай арганізацыі не існавала. Тым не менш, Колас вымушаны быў пісаць тлумачэнне. Яно было недастатковае. Тады яго падштурхнулі, каб ён напісаў паўторна, потым каб выступіў у друку з пакаянным лістом, дзе прызнаваў свае памылкі. Але як ён тыя памылкі прызнаваў? Вельмі высакародна сябе паводзіў: нікога не закладваў, не казаў, што ёсць такія ці сякія, нават калі нейкія людзі былі ўжо арыштаваны па гэтай справе. Ён прызнаваў віну ў тым, што калі працаваў у Акадэміі навук, то ні пісьмова, ні вусна не выкрываў "нацдэмаў", якія адводзілі навукоўцаў і літаратуру ад правільнага шляху. Зразумела, што ён вымушаны быў займацца самаагаворам.

**— Верагодна, што на чалавека такога ўзроўню ціснулі. Але, магчыма, адкрылася нешта, што вас прыемна ўразіла?**

— Багата матэрыялу, які паказвае не толькі негатыўныя і змрочныя фрагменты жыцця Коласа, але і тое станоўчае, што мы мала ведаем пра яго. Напрыклад, удзел Коласа ў канферэнцыях, у распрацоўцы праблем беларускай мовы, дыялекталогіі, выпрацоўка нормаў правапісу. Гэтага матэрыялу раней не было. Цяпер спецыялісты розных кірункаў могуць адкрыць пэўны аспект: мовазнаўцы, літаратуразнаўцы, гісторыкі. Гісторык рэлігіі, напрыклад, знойдзе матэрыял пра тое, як Колас хацеў царкву ў Беларусі бачыць больш беларускай. Потым яму часта ўспаміналі гэта. У выніку мы бачым аблічча самога Коласа, што ён намнога больш шматгранны не толькі як пісьменнік, але і як культурны і грамадскі дзеяч. Шэраг матэрыялаў датычаць яго публіцыстычных выступленняў. Гэтыя дакументы даюць вельмі многа літаратуразнаўству — у прыватнасці, узбагачаюць яго тым матэрыялам, які прымушае нас у новым ракурсе паглядзець на сам літаратурны працэс, на тое культурна-літаратурнае жыццё 20-30-х, 40-х гадоў.

Ёсць дакументы, звязаныя з правядзеннем юбілеяў Песняроў. Яны сведчаць, як беларускія літаратурныя і партыйныя арганізацыі, прадстаўнікі кіраўніцтва краіны звярталіся ў Маскву з просьбай дазволіць правесці юбілейны вечар, пісалі, хто павінен там быць дакладчыкам. Чытаеш — і бачыш, што гісторыя літаратуры, якую мы раней пісалі (я ў тым ліку) патрабуе абнаўлення. Гэтыя дзве кніжкі і трэцяя, якая падрыхтавана, паслужаць вельмі значнай справе грунтоўнага абнаўлення нашых ведаў, уяўлення пра літаратурны працэс, пра асабістае жыццё класікаў, пра іх грамадскую дзейнасць, культурную, навуковую. Няма мяжы той працы, якую зрабілі Віталь Скалабан і Вячаслаў Селяменеў як укладальнікі, і ўвесь калектыў, які меў дачыненне да выхаду кніг.

Наогул, заўсёды важныя любыя новыя звесткі, сведчанні. Мы цяпер набліжаемся да выдання поўнага збору твораў Якуба Коласа ў 20 тамах. На выхадзе 17 том. А раней было 16 тамоў. Дык дадатковыя 6 тамоў вельмі ўзбагачаюць ранейшае ўяўленне пра Якуба Коласа. Як пра пісьменніка, можа, і не істотна — новых твораў мы не знайшлі, каб яны карэнным чынам мянялі наша ўяўленне пра яго.

**— Але ж для разумення творцы важныя яшчэ і яго чалавечыя ўчынкі?**

— Гэтыя ўчынкі вельмі добра раскрываюцца праз лісты, праз публіцыстычныя артыкулы, часткова праз дзённік. Зараз усё друкуецца без купюр. Купюр, на жаль, было многа. Нейкія рабіліся складальнікамі ў 70-я, 80-я гады, нейкія падказваліся рэдактарамі выдавецтваў. Цяпер 20-томны збор твораў друкуецца ў максімальна поўным аб'ёме, з вялікімі навуковымі каментарыямі і пасляслоўямі. Я меў гонар напісаць прадмову да гэтага збору твораў у 20-ці тамах, яна змешчана ў першым томе і называецца "Свайму часу і вечнасці". Два гэтыя словы раскрываюць агульную мэтаўстаноўку, якую мы як складальнікі і я як адзін з

кіраўнікоў гэтага праекта ставілі перад сабой. Паказаць, што Колас зрабіў для свайго часу і які ўклад яго ў сусветную літаратуру. Аказалася, што трэба яшчэ і пасляслоўе пісаць, асабліва для такіх складаных твораў, як "Адшчапенец", "На шляхах волі", да публіцыстыкі, да літаратурнай крытыкі... У каментарыях якраз і тлумачыцца, чым было выклікана з'яўленне такога артыкула, як "Рэформа правапісу і фашысцкія музыкі". Альбо артыкул "Слон і моська" — водгук на вайну Савецкага Саюза і Фінляндыі. Трэба патлумачыць, якімі абставінамі — псіхалагічнымі, грамадска-палітычнымі — гэта выклікана. Бо мы хочам паказаць Коласа такім, якім ён быў. Каб ён паўставаў у свядомасці чытачоў у больш аб'ектыўным асвятленні, без паляпшэння і без крытыканства. Бо нам патрэбны аналіз і аб'ектыўная ацэнка зробленага Коласам як творцам і як чалавекам. Мы прызнаём і паказваем, што ён вымушаны быў часта пагаджацца з нечым,ісці насуперак сваім перакананням. Але гэтым не закрэсліваецца яго роля як вядучага аўтарытэтнейшага пісьменніка ў беларускай літаратуры, як аўтара бессмяротнай "Новай зямлі" і "Сымона-музыкі", "Казак жыцця" і так далей.

**— Шмат хто цікавіцца жыццём Купалы і працягвае чакаць раскрыцця галоўнай таямніцы яго смерці. На вашу думку, ці будзе наогул магчымасць пра гэта даведацца? Ці могуць з'явіцца дакументы, якія пакажуць сутнасць таго, што адбылося ў атэлі "Масква"?**

— ...Зойдзем з другога боку. У 1943 годзе Якуб Колас выступіў з артыкулам, дзе казаў пра тое, што ніякіх перамоў з Гітлерам не можа быць, што нікому не ўдасца разрэзаць надвае жывое беларуска-украінскае цела. Хто хацеў разрэзаць цела Беларусі і Украіны?.. Няма звестак пра гэта. Калі тут быў кіраўнік Федэральнага архіўнага агенцтва Расіі, я задаў яму пытанне: як нам гэта тлумачыць? І ён сказаў, што ніякіх матэрыялаў аб сепаратных перагаворах Савецкага Саюза з Гітлерам няма. Але ж Колас не мог гэтага выдумаць. Значыць, былі нейкія чуткі. Магчыма, гэта адбылося "дзякуючы" нямецкай контрразведцы, магчыма, была дэзынфармацыя. Колас, які быў цесна звязаны са славянскім камітэтам, мог чуць нейкія такія размовы, у якіх праводзілася лінія, што частка Беларусі і Украіны адыходзіць Германіі. Больш за тое, у 1943 годзе польскі ўрад Сікорскага ў Англіі выступіў з такой прапановай: маўляў, мы не будзем падымаць пытанне пра Катынь, але вы пагадзіцеся з тым, каб мяжа лічылася па 1939 годзе. Натуральна, што Колас мог абурыцца: гэта ж беларуская зямля. Мы такія словы павінны былі каментаваць, як разумеем. Але матэрыялаў, як сказаў расійскі архівіст, у архівах не знойдзена...

Ці будзе знойдзены які дадатковы матэрыял у далейшым, цяжка сказаць. Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч, якому прысвечана мая кніжка як пачынальніку "Каласавін", лічыў, што не было сэнсу розным уплывовым сілам учыняць дыверсію — знішчаць Купалу. Бо пісаў ён так, як патрабаваў час: заклікаў біць гітлераўцаў паганых. Больш за тое, ёсць матэрыял (ён таксама змешчаны ў кнігах "Купала і Колас, вы нас гадавалі") пра тое, як акупацыйныя ўлады забаранялі друкаванне твораў Купалы і Коласа савецкага перыяду, але мясцовыя прадстаўнікі самакіравання прасілі змяшчаць у школьных падручніках дакастрычніцкія творы Купалы і Коласа з тлумачэннем, што яны сапраўдныя беларускія, а тыя, што пазней — няправільныя. І гэты матэрыял таксама працуе на абнаўленне вобразаў Купалы і Коласа ў свядомасці беларусаў.

*Ларыса ЦІМОШЫК*